Весці БДПУ. Серыя 2. 2017. № 2. С. 11–16.

УДК 94(476)

# ВЫШЭЙШАЕ САСЛОЎЕ БЕЛАРУСІ (1785–1914 гг.): ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ*

**А. П. Жытко,**
*доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі славянскіх народаў БДПУ;*

**К. Г. Куцко,**
*студэнтка 4 курса гістарычнага факультэта БДПУ*

Паступіў у рэдакцыю 17.04.17.

UDC 94(476)

# THE UPPER CLASS OF BELARUS (1785–1914): HISTORIOGRAPHY OF THE PROBLEM

**A. Zhytko,**
*Doctor of History, Professor of the Department of History of Belarus and Slavic Peoples, BSPU;*

**K. Kutsko,**
*Student of the 4th year of the Faculty of History, BSPU*

Received on 17.04.17.

Гісторыя вышэйшага саслоўя Беларусі стала прадметам навуковага вывучэння ў айчыннай гістарыяграфіі практычна толькі з канца XX ст. У пэўнай ступені даследаваны дынаміка колькасці, структура, крыніцы папаўнення, канфесійны склад дваранства, а таксама яго роля ў сацыяльна-эканамічным развіцці краю. Праблема ж нацыянальнай прыналежнасці вышэйшага саслоўя, яго органаў самакіравання не стала аб’ектам спецыяльных даследаванняў, а яго асобныя аспекты закраналіся ў сувязі з іншымі пытаннямі, якія тычыліся ролі і месца вышэйшага саслоўя ў жыцці Беларусі. У артыкуле прааналізаваны асноўныя напрацоўкі беларускіх і замежных гісторыкаў, выяўлены асобныя аспекты праблемы перспектыўнага вывучэння.

*Ключавыя словы:* Беларусь, дваранства, гістарыяграфія, дваранскае самаўпраўленне, шляхта, Расійская імперыя.

The history of the upper class of Belarus became the subject of the scientific study in the national historiography since the end of the XXth century. The population dynamics, structure, sources of its formation, religious composition of the nobility, as well as its role in social and economic development of the region are investigated to a certain extent. The problem of the national identity of the upper class and authorities have not been the subject of the special research but some of the aspects were raised in the connection with other issues concerning the role and place of upper-class in Belarus development. The main achievements of Belarusian and foreign historians are analyzed in the article and some aspects of the prospective studies are also revealed.

*Keywords:* Belarus, nobility, historiography, nobility self-government, Polish gentry, Russian Empire.

*Уводзіны.* Гістарыяграфічны аналіз любой праблемы вымагае ад даследчыкаў шэрагу метадычных патрабаванняў. Каб, па магчымасці, пазбегнуць суб’ектыўных ацэнак, гісторык павінен прытрымлівацца прынцыпу гістарызму, аб’ектыўнасці і каштоўнаснага падыходу. Мы ацэньваем заслугі навукоўцаў, зыходзячы з таго, які ўклад у распрацоўку праблемы ўнеслі больш позніх даследчыкі ў параўнанні са сваімі папярэднікамі. Пры гэтым неабходна ўлічваць характар грамадска-палітычнай сітуацыі ў той ці іншы час, узровень развіцця гістарычнай навукі ў цэлым і г. д. У сувязі з гэтым вывучэнне гісторыі вышэйшага саслоўя Беларусі правамерна ўмоўна падзяліць на наступныя этапы: дарэвалюцыйны, савецкі і постсавецкі.

У дарэвалюцыйнай гістарыяграфіі гісторыя дваранства Расійскай імперыі больш-менш поўна была вывучана да 1861 г. У парэформенны перыяд публікацыі насілі ў асноўным палемічны характар, што было выклікана мадэрнізацыйнымі працэсамі ў сацыяльна-эканамічным развіцці Расійскай імперыі.

У савецкай гістарыяграфіі лічылася, што дваранства з’яўлялася рудыментам феадальнай эпохі, сацыяльнай апорай самаўладдзя, носьбітам прыгонніцкіх перажыткаў у эканоміцы. У сувязі з гэтым дваранская праблематыка не з’яўлялася актуальнай. Толькі з канца 70-х гг. XX ст. вышэйшае саслоўе трапіла ў поле зроку даследчыкаў. Зыходзячы з партыйна-класавага падыходу, савецкія гісторыкі адмоўна ацэньвалі ролю і месца дваранства ў сацыяльна-эканамічным і палітычным жыцці краіны.

У постсавецкі перыяд з’явіўся шэраг даследаванняў, у якіх дваранства разглядаецца не толькі як носьбіт перажыткаў феадальнай

1 Артыкул падрыхтаваны ў рамках выканання задання Беларускага фонду фундаментальных даследаванняў.

Рэпазіторый БДПУ

эпохі, але і як інтэлектуальная эліта грамадства ў дарэвалюцыйную эпоху.

*Асноўная частка.* Вышэйшае саслоўе Расійскай імперыі адыгрывала значную ролю ў палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным развіцці краіны. Разам з тым, гісторыя дваранства да сярэдзіны XIX ст. практычна не з'яўлялася прадметам даследаванняў навукоўцаў. В. Ключэўскі адзначаў як цікавы момант, што «да гэтай пары мы не сустракаем слушнай, поўнай гісторыі двух вышэйшых саслоўяў Расіі – дваранства і духавенства» [1, с. 31]. У працах дарэвалюцыйных расійскіх аўтараў па праблеме дваранства ёсць толькі згадкі і асобныя заўвагі, якія маюць, як правіла, агульны змест. Расійская дарэвалюцыйная гістарыяграфія разглядала дваранства Беларусі як складовую частку саслоўя імперыі і, разам з тым, як асобны і апазіцыйны расійскай дзяржаве элемент, які неправамерна карыстаўся дваранскімі прывілеямі ў імперыі. У сувязі з гэтым варта адзначыць некалькі спецыяльных расійскіх дарэвалюцыйных прац: А. Рамановіч-Славацінскага [2], М. Яблачкава [3], М. Паўлава-Сільванскага [4]. У асноўным яны грунтуюцца на інфармацыі заканадаўчых крыніц і пераважна тычацца саслоўнай палітыкі расійскага ўрада. А. Рамановіч-Славацінскі падзяліў набілітэт заходніх губерняў на дзве асноўныя часткі – магнатаў і шляхту. Ён засяродзіў увагу на палітыцы «разбору» шляхты, якой даваў станоўчую адзнаку. Лічыў, што рэпрэсіі былі апраўданымі, але запозненымі [2, с. 96].

Пэўная інфармацыя пра становішча дваранства Беларусі змешчана ў даследаваннях М. Каяловіча [5] і С. Корфа [6]. У сваіх працах М. Каяловіч разглядаў пытанні этнічнай прыналежнасці дваранства, якое аўтар называў і «заходнерускім», і «літоўскім», і «польскім» [5, с. 210–211, 302–310].

А. Нольдэ даследаваў змены ў прававым становішчы розных катэгорый былой «польскай» шляхты і шляхты-татар [7, с. 142–145, 190–191]. Па прычыне вялікай колькасці выкарыстаных дакументальных крыніц найбольшую навуковую каштоўнасць па пытаннях саслоўнай палітыкі ўрада ў дачыненні да дваранства маюць артыкулы П. Жуковіча [8–10] і В. Вешнякова [11].

У канцы XIX ст. падчас работы Асобай нарады па справах дваранскага саслоўя павялічылася колькасць артыкулаў і брашур публіцыстычнага характару. У публікацыях прадстаўнікоў дваранска-кансерватыўнай гістарыяграфіі праводзілася ідэя аб памылковасці правядзення буржуазных рэформ у другой палове XIX ст. і неабходнасці дзяржаўнай падтрымкі вышэйшага саслоўя як галоўнай сацыяльнай апоры самадзяржаўя [12; 13].

Канцэпцыя ліберальна-апазіцыйнай гістарыяграфіі грунтавалася на прызнанні непазбежнасці мадэрнізацыйных пераўтварэнняў, якія прывялі да паступовай страты дваранствам сваіх вядучых пазіцый у сістэме самадзяржаўнай улады і кіравання. У гэтым сэнсе характэрна праца гуртка вольных даследчыкаў Санкт-Пецярбурга, якія адзначалі, што «рускія дваранскія ўстановы, паколькі яны звязаны з кацярынінскай ідэяй дваранскай карпарацыі, заўсёды мелі больш дакаратыўнае, чым земскае, значэнне. Цяпер умовы змяніліся. У сувязі з вызваленнем сялян і іншымі змяненнямі дваранская карпарацыя, якая была створана Кацярынай, страціла сваё ўніверсальнае значэнне і пераўтварылася ў звычайны гурток асоб, якія займаюць у дзяржаве свой пэўны пункт погляду, што адлюстроўвае іх групавыя інтарэсы, якія нярэдка супярэчаць агульнанародным» [14, с. 25]. У сувязі з гэтым С. Дзядзюлін, які зыходзіў з славянафільскіх пазіцый, заклікаў дваран да маральнасці, грамадзянскасці, адказу ад саслоўных прывілей у новую эпоху [15, с. 41–55].

На думку прадстаўнікоў народніцкай гістарыяграфіі, дваранства – гэта не абавязковы элемент феадальнай структуры грамадства ў Расійскай імперыі, а вынік штучнага насаджэння дзяржавай заходніх пачаткаў, якія былі нехарактэрнымі для рускай гісторыі, не ўласцівы такому дэмакратычнаму народу, як рускі . Такое заключэнне М. Рубакіна з'явілася абгрунтаваннем яго галоўнай высновы аб эканамічнай і палітычнай інфантыльнасці вышэйшага саслоўя Расіі [16, с. 52, 58].

Такім чынам, дарэвалюцыйная расійская гістарыяграфія гісторыі дваранства XIX – пачатку XX ст. багатая па колькасці прац. У сувязі з тым, што вышэйшае саслоўе даследавалася сучаснікамі, гэта не магло не паўплываць на іх характар. Абсалютная большасць прац насіла палемічны характар. Больш-менш аб'ектыўныя высновы аб месцы і ролі дваранства былі зроблены даследчыкамі ліберальна-апазіцыйнага лагера. Сур'ёзна даследавалася зямельнае пытанне, а разам з ім і памеснае дваранства. Між іншым, гісторыя вышэйшага саслоўя Беларусі, а тым больш яго карпаратыўная арганізацыя, не з'яўляліся прадметам спецыяльных даследаванняў. На яго звярталі ўвагу ў сувязі з паўстаннямі 1830–1831 гг. і 1863–1864 гг., а затым – з Першай расійскай рэвалюцыяй. Разам з тым, дарэвалюцыйныя даследаванні даюць магчымасць зразумець сацыяльную атмасферу таго часу, шмат якія назіранні, зафіксаваныя тагачаснымі даследчыкамі, могуць быць уключаны ў якасці крыніц у сучасныя працы.

У савецкай гістарыяграфіі практычна да 70-х гг. XX ст. не існавала даследаванняў, пры-

Рэпазіторый БДПУ

свечаных гісторыі дваранства і яго саслоўным органам самакіравання. Першая сур'ёзная праца па гэтай праблеме з'явілася толькі ў 1973 г., калі выйшла ў свет манаграфія Ю. Б. Салаўёва [17]. Прадметам яго даследавання была палітыка самадзяржаўя ў дачыненні да дваранства 80–90-х гг. XIX ст. Разам з тым, хаця само вышэйшае саслоўе не аналізуецца, але працэсы ўнутры яго выяўляюцца праз хадайніцтвы дваранскіх сходаў і рэакцыю на іх правячых вярхоў. Як працяг гэтай манаграфіі ў 1981 г. з'явілася яго праца «Самодержавие и дворянство в 1902–1907 гг.» [18]. Узаемаадносіны паміж самадзяржаўнай уладай, буржуазіяй і дваранствам пасля Першай расійскай рэвалюцыі знайшлі дакладнае асвятленне ў манаграфіях В. С. Дзякіна [19; 20]. На жаль, і ў гэтых працах дваранства як саслоўе не вывучалася.

Значнай падзеяй у савецкай гістарыяграфіі з'явіўся выхад у свет манаграфіі А. П. Карэліна [21]. Упершыню аўтар на падставе матэрыялаў Асобай нарады па справах дваранскага саслоўя (1897–1901 гг.) прааналізаваў юрыдычны, колькасны і нацыянальны склад дваранства імперыі, яго сацыяльна-эканамічны статус, на асобных прыкладах паказаў працэс класавага разлажэння ў асноўным гарадскога дваранства, даследаваў карпаратыўную арганізацыю саслоўя, яго ролю ў сістэме мясцовага кіравання, а таксама петыцыйную дзейнасць дваранскіх сходаў. У манаграфіі ёсць паасобныя сюжэты, якія тычацца вышэйшага саслоўя пяці паўночна-заходніх губерняў. Разам з тым, аўтар неправамерна падзяліў усё дваранства Беларусі на «польскае» і «рускае» па нацыянальнай прымеце [21, с. 45].

Для беларускай савецкай гістарыяграфіі былі характэрны тыя ж тэндэнцыі, што і для ўсіх гістарычных даследаванняў у СССР, толькі са сваёй рэгіянальнай спецыфікай. У 20-х гг. XX ст. канцэнтравалася ўвага на нацыянальнай ідэнтыфікацыі дваранства Беларусі. У прыватнасці, У. Ігнатоўскі даследаваў польскі палітычны, рэлігійны і культурны ўплывы на беларускае вышэйшае саслоўе. Яны разумеліся ім як пераймание ладу жыцця, польскіх звычаяў і мовы беларускім набілітэтам [22, с. 140]. Фактычна, пачынаючы з У. Ігнатоўскага, у беларускай савецкай гістарыяграфіі паланізацыя стала трактавацца толькі як вынік палітычных намаганняў польскіх уладаў, што пераклікалася з пазіцыяй афіцыйна-ахоўнай гістарыяграфіі ў Расійскай імперыі і СССР. А. Цвікевіч засяродзіў сваю ўвагу на палітыцы «заходнерусізму» і мерапрыемствах царызму па падтрымцы гэтай плыні ў гісторыі грамадзянскай думкі ў Беларусі. Пры гэтым аўтар пераканаўча паказаў працэс русіфікацыі краю, насаджэння рускага землеўладання, заахвочвання чыноўнікаў з унутраных губерняў імперыі для службы ў заходніх губернях. Ён, як і У. Ігнатоўскі, падзяляў дваранства краю на польскае і рускае, а саслоўная арганізацыя выпала з поля зроку даследчыка [23, с. 6].

У 1980 г. пасля даволі працяглага перапынку ў даследаванні праблемы была выдадзена манаграфія С. М. Самбук «Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века» [24]. У працы была выкарыстана вялікая колькасць заканадаўчых актаў, матэрыялаў розных міністэрстваў і ведамстваў. Аўтар звярнула ўвагу на тое, што палітыка самадзяржаўя была непаслядоўнай, вагалася ў залежнасці ад пазіцыі таго ці іншага Віленскага генерал-губернатара або міністра ўнутраных спраў. Зразумела, што прадметам даследавання С. М. Самбук была палітыка самадзяржаўя, а не асабіста дваранства. Таму шэраг аспектаў гісторыі вышэйшага саслоўя Беларусі не знайшоў свайго адлюстравання.

У апошнія дзесяцігоддзі дваранская праблематыка прыцягвала ўвагу гісторыкаў Беларусі. Па гісторыі вышэйшага саслоўя краю дарэформеннага перыяду абаронены тры кандыдацкія дысертацыі, надрукаваны дзясяткі артыкулаў [25–29].

Нацыянальны склад і сацыяльнае аблічча дваранства Беларусі другой паловы XIX ст. акрэслены ў артыкуле А. Г. Каханоўскага і яго манаграфіі «Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.)» [30]. Але, як адзначае даследчык дваранства А. П. Жытко, у гэтай працы, услед за З. Я. Тальвірскай [31, с. 200], сцвярджаецца, што на пачатку 60-х гг. XIX ст. толькі 14 % спадчынных дваран з'яўляліся землеўладальнікамі. Справа ў тым, што такія працэнтныя суадносіны З. Я. Тальвірская вывела на падставе аналізу дваранства толькі трох паветаў Мінскай губерні, а яны не характарызуюць увесь рэгіён поўнасцю.

У манаграфіі «Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг.» А. П. Жытко [32] на падставе багатай інфармацыі крыніц і сучасных метадалагічных падыходаў прааналізаваў дынаміку колькаснага, веравызнальнага і нацыянальнага складу вышэйшага саслоўя Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Аўтар даследаваў палітыку царскага ўрада ў дачыненні да дваранскай саслоўнай карпарацыі, асаблівасці фарміравання інстытута губернскіх і павятовых прадвадзіцелей дваранства, а таксама ролю вышэйшага саслоўя ў сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі. У калектыўнай манаграфіі «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці» А. П. Жытко ў агульных рысах раскрыў ролю і месца дваранскіх сходаў у карпаратыўным жыцці набілітэту края [33].

Рэпазіторый БДПУ

У працах польскіх гісторыкаў закраналіся такія праблемы, як працэс паланізацыі дваран «усходніх крэсаў», палітыка самадзяржаўя ў дачыненні да вышэйшага саслоўя, яго канфесійны і нацыянальны склад, дваранскае землеўладанне і г. д. Неабходна адзначыць, што ў польскай гістарыяграфіі няма адназначных ацэнак становішча дваран-католікаў у Беларусі ў азначаны час. Большасць гісторыкаў лічыць, што канфесійная прыналежнасць служыць галоўным крытэрыем нацыянальнай ідэнтыфікацыі дваранства [34, с. 60; 35, с. 19–20; 36, с. 64]. У той жа час В. Вярэніч сцвярджае, што перасяленні прадстаўнікоў вышэйшых сацыяльных класаў з Польшчы ў Беларусь мелі эпізадычны характар [37, с. 207]. Р. Радзік даказвае, што спольшчанае дваранства беларуска-польскага памежжа змагалася за Польшчу, але яно называла сябе ліцвінамі, мела вялікія пачуцці замілаванасці да сваёй радзімы – Літвы-Беларусі. Разам з тым, аўтар адзначае, што вышэйшае саслоўе недастаткова ўсведамляла вартасць культурнага патэнцыялу беларускага этнасу – шырокіх народных мас [38, с. 110, 112]. Палітыку самадзяржаўя ў дачыненні да дробнай шляхты з канца XVIII да 1868 г. даследавала І. Сікорска-Кулеша [39]. Яна вылучыла характэрныя рысы гэтай палітыкі ў розныя гады, скрупулёзна раскрыла механізм «разбору шляхты» на «сапраўдную» і «фальшывую» у 1831–1834 гг., пераводу апошняй у стан аднадворцаў і гараджан. Аналізуецца таксама працэс верыфікацыі шляхты ў 1834–1863 гг. Даследчыца адзначае, што ціск на дробную шляхту ў 1940–50-х гг. некалькі паменшыўся, але паражэнне паўстання 1863–1864 гг. і палітыка самадзяржаўя пасля яго фактычна ліквідавалі шляхту як сацыяльную групу.

У англа-амерыканскай гістарыяграфіі неабходна выдзеліць манаграфію С. Бекера «Миф о русском дворянстве: Дворянство и привилегии последнего периода императорской России» [40], у якой аўтар даследаваў лёс вышэйшага саслоўя Расійскай імперыі ў складаную для яго эпоху, якая наступіла пасля вызвалення сялян ад прыгоннай залежнасці. У манаграфіі выкарыстана багатая інфармацыя крыніц з фондаў Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва і статыстычных зборнікаў, крытычна асэнсаваны высновы расійскіх і замежных гісторыкаў дваранства. Аўтар прааналізаваў разрады спадчынных дваран, крыніцы папаўнення саслоўя, яго дзяржаўную службу, эвалюцыю дваранскага землеўладання і яго кошт, іпатэчную запазычанасць, палітыку самадзяржаўя, накіраваную на стабілізацыю дваранскага землеўладання ў парэформенны перыяд і г. д. На падставе даных Першага перапісу насельніцтва 1897 г. С. Бекер першым у замежнай гістарыяграфіі распрацаваў размеркаваць вышэйшае саслоўе імперыі, у тым ліку і пяці беларускіх губерняў, па нацыянальнай прыкмеце. Ён катэгарычна адмовіўся ад стэрэатыпу атаясамлення канфесійнай прыналежнасці асобы з нацыянальнай у рускай і польскай гістарыяграфіі. У аснову сваіх падлікаў аўтар паклаў лінгвістычны (моўны) фактар. Разам з тым, С. Бекер дапусціў метадычную памылку, калі аб'яднаў спадчыннае і асабовае дваранства па роднай мове. Гэта некалькі паменшыла працэнт дваран-беларусаў і павялічыла колькасць рускіх [40, с. 294]. Справа ў тым, што абсалютную большасць спадчынных дваран складалі беларусы, а сярод асабовых дваран пераважалі рускія чыноўнікі, якія былі накіраваны на дзяржаўную службу ў Беларусь, асабліва пасля паўстання 1863–1864 гг.

*Заключэнне.* Такім чынам, у айчыннай і замежнай гістарычнай навуцы ў пэўнай ступені знайшлі сваё адлюстраванне такія аспекты праблемы, як палітыка самадзяржаўя ў адносінах да набілітэту Беларусі, працэс «разбору шляхты», дынаміка колькаснага, канфесійнага і нацыянальнага складу дваранства, замяшчэнне дзяржаўных і судовых пасад па выбарах ад вышэйшага саслоўя і інш.

Разам з тым, у айчыннай гістарыяграфіі наогул адсутнічаюць даследаванні па праблемах структуры і функцый карпаратыўнай арганізацыі вышэйшага саслоўя, фарміравання і дзейнасці дваранскіх дэпутацкіх сходаў, дваранскіх апек, месца і ролі інстытута губернскіх і павятовых прадвадзіцелей дваранства ў сістэме мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання.


Літаратура

1. *Ключевский, В. О.* История сословий в России : Курс, читанный в Московском университете в 1886 году / В. О. Ключевский. – М. : Тип. П. П. Рябушинского, 1914. – 2-е изд. – 412 с.
2. *Романович-Славатинский, А. В.* Дворянство в России от начала XVIII века до отмены крепостного права / А. В. Романович-Славатинский. – СПб. : Тип. Министерства внутренних дел, 1870. – 594 с.
3. *Яблочков, М.* История дворянского сословия в России / М. Яблочков – СПб. : Тип. А. М. Котомина, 1876. – 680 с.
4. *Павлов-Сильванский, Н. П.* Сочинения : в 3 т. / Н. П. Павлов-Сильванский. – СПб. : Тип. М. М. Стасюлевича. – 1909. – Т. 2. – 336 с.

References

1. *Klyuchevskiy, V. O.* Istoriya sosloviy v Rossii : Kurs, chitannyy v Moskovskom universitete v 1886 godu / V. O. Klyuchevskiy. – M. : Tip. P. P. Ryabushinskogo, 1914. – 2-ye izd. – 412 s.
2. *Romanovich-Slavatinskiy, A. V.* Dvoryanstvo v Rossii ot nachala XVIII veka do otmeny krepostnogo prava / A. V. Romanovich-Slavatinskiy. – SPb. : Tip. Ministerstva vnutrennikh del, 1870. – 594 s.
3. *Yablochkov, M.* Istoriya dvoryanskogo sosloviya v Rossii / M. Yablochkov. – SPb. : Tip. A. M. Kotomina, 1876. – 680 s.
4. *Pavlov-Silvanskiy, N. P.* Sochineniya : v 3 t. / N. P. Pavlov-Silvanskiy. – SPb. : Tip. M. M. Stasylevicha. – 1909. – T. 2. – 336 s.


Рэпазіторый БДПУ

5. *Коялович, М. О.* Чтения по истории Западной России / М. О. Коялович. – 4-е изд. – СПб. : Тип. А. С. Суворина, 1884. – 343 с.
6. *Корф, С. А.* Дворянство и его сословное управление за столетие 1762–1855 годов / С. А. Корф. – СПб. : Тип. Тренке и Фюсно, 1906. – 720 с.
7. *Нольдэ, А. Э.* Очерки по истории кодификации местных гражданских законов при графе Сперанском : в 2 вып. / А. Э. Нольдэ. – СПб. : Сенат тип., 1906–1914. – Вып. 1 : Попытка кодификации литовско-польского права. – 1906. – 322 с.
8. *Жукович, П.* Управление и суд в Западной России в царствование Екатерины II / П. Жукович // Журнал министерства народного просвещения. – 1914. – № 2. – С. 265–315; № 3. – С. 88–120; № 4. – С. 314–355; № 5. – С. 1–43.
9. *Жукович, П.* Сословный состав Западной России в царствование Екатерины / П. Жукович // Журнал министерства народного просвещения. – 1915. – № 1. – С. 76–109; № 2. – С. 257–321; № 5. – С. 130–178;
10. *Жукович, П.* Россия в царствование императора Павла I / П. Жукович // Журнал министерства народного просвещения. – 1916. – № 6. – С. 183–226; № 8. – С. 207–263; № 9. – С. 186–275.
11. *Вешняков, В. И.* Исторический обзор происхождения разных названий государственных крестьян / В. И. Вешняков // Журн. М-ва гос. имуществ. – 1857. – Ч. 62. – Отд.1. – С. 13–35; 87–98; Ч. 63. – Отд. 1. – С. 9–33; Ч. 65. – Отд. 1. – С. 57–96.
12. *Елишев, А. И.* Дворянское дело : сб. ст. / А. И. Елишев. – М. : Унив. тип., 1898. – 63 с.
13. *Кошкарев, И. Д.* Современное состояние России и сословный вопрос / И. Д. Кошкарев. – М. : б. и., 1896. – 186 с.
14. Русское дворянство. Кружок свободных исследователей. – СПб. : б. и., 1907. – 49 с.
15. *Дедюлин, С. А.* Крестьянское самоуправление в связи с дворянским вопросом / С. А. Дедюлин. – СПб. : б. и., 1902. – 192 с.
16. *Рубакин, Н. А.* Россия в цифрах. Опыт статистической характеристики сословно-классового состава населения русского государства / Н. А. Рубакин. – СПб. : Изд-во «Вестника знания» (В. В. Битнера), 1912. – 216 с.
17. *Соловьев, Ю. Б.* Самодержавие и дворянство в конце XIX века / Ю. Б. Соловьев. – Л. : Наука, 1973. – 378 с.
18. *Соловьев, Ю. Б.* Самодержавие и дворянство в 1902–1907 гг. / Ю. Б. Соловьев. – Л. : Наука, 1981. – 256 с.
19. *Дякин, В. С.* Самодержавие, буржуазия и дворянство в 1907–1911 гг. / В. С. Дякин. – Л. : Наука, 1978. – 246 с.
20. *Дякин, В. С.* Буржуазия, дворянство и царизм в 1911–1914 гг.: Разложение третьеиюньской системы / В. С. Дякин. – Л. : Наука, 1988. – 230 с.
21. *Корелин, А. П.* Дворянство в пореформенной России. 1861–1904 гг. Состав, численность, корпоративная организация / А. П. Корелин. – М. : Наука, 1979. – 304 с.
22. *Ігнатоўскі, У.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. Ігнатоўскі. – 5-е выд. – Мінск : Беларусь, 1991. – 140 с.
23. *Цьвікевіч, А.* «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзкай мысьлі на Беларусі ў XIX і пачатку XX в. / А. Цьвікевіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 350 с.
24. *Самбук, С. М.* Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века / С. М. Самбук. – Минск : Наука и техника, 1980. – 223 с.
25. *Луговцова, С. Л.* Политика российского самодержавия по отношению к дворянству Беларуси в конце XVIII – первой половине XIX в. : дис. …канд. ист. наук: 07.00.02 / С. Л. Луговцова. – Минск, 1997. – 130 л.
26. *Тумилович, Г. Н.* Дворянство Беларуси в конце XVIII – первой половине XIX в. : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Г. Н. Тумилович. – Минск, 1997. – 165 л.
27. *Макарэвіч, В. С.* Дробная шляхта Беларусі ў 30–60-я гг. XIX ст. : склад і эвалюцыя сацыяльна-прававога становішча / В. С. Макарэвіч. – Мінск : БДУ, 2008. – 159 с.
28. *Грыцкевіч, А.* Беларуская шляхта / А. Грыцкевіч // Спадчына. – 1993. – № 1. – С. 11–16.

5. *Koyalovich, M. O.* Chteniya po istorii Zapadnoy Rossii / M. O. Koyalovich. – 4-ye izd. – SPb. : Tip. A. S. Suvorina, 1884. – 343 s.
6. *Korf, S. A.* Dvoryanstvo i yego soslovnoye upravleniye za stoletiye 1762-1855 godov / S. A. Korf. – SPb. : Tip. Trenke i Fyusno, 1906. – 720 s.
7. *Nolde, A. E.* Ocherki po istorii kodifikatsii mestnykh grazhdanskikh zakonov pri grafe Speranskom : v 2 vyp. / SPb. : Senat tip., 1906-1914. – Vyp. 1 : Popytka kodifikatsii litovsko-polskogo prava. – 1906. – 322 s.
8. *Zhukovich, P.* Upravleniye i sud v Zapadnoy Rossii v tsarstvovaniye Yekateriny II / P. Zhukovich // Zhurnal ministerstva narodnogo prosveshcheniya. – 1914. – № 2. – S. 265–315; № 3. – S. 88–120; № 4. – S. 314–355; № 5. – S. 1–43.
9. *Zhukovich, P.* Soslovnyy sostav Zapadnoy Rossii v tsarstvovaniye Yekateriny / P. Zhukovich // Zhurnal ministerstva narodnogo prosveshcheniya. – 1915. – № 1. – S. 76–109; № 2. – S. 257–321; № 5. – S. 130–178.
10. *Zhukovich, P.* Rossiya v tsarstvovaniye imperatora Pavla I / P. Zhukovich // Zhurnal ministerstva narodnogo prosveshcheniya. – 1916. – № 6. – S. 183–226; № 8. – S. 207–263; № 9. – S. 186–275.
11. *Veshnyakov, V. I.* Istoricheskiy obzor proiskhozhdeniya raznykh nazvaniy gosudarstvennykh krestyan / V. I. Veshnyakov // Zhurn. M-va gos. imushchestv. – 1857. – Ch. 62. – Otd. 1. – S. 13–35; 87-98; Ch. 63. 0 Otd. 1. – S. 9-33; Ch. 65. – Otd. 1. – S. 57–96.
12. *Yelishev, A. I.* Dvoryanskoye delo : sb. st. / A. I. Yelishev. – M. : Univ. tip., 1898. – 63 s.
13. *Koshkaryov, I. D.* Sovremennoye sostoyaniye Rossii i soslovnyy vopros / I. D. Koshkaryov. – M. : b. i., 1896. – 186 s.
14. Russkoye dvoryanstvo. Kruzhok svobodnykh issledovateley. – SPb. : b. i., 1907. – 49 s.
15. *Dedyulin, S. A.* Krestyanskoye samoupravleniye v svyazi s dvoryanskim voprosom / S. A. Dedylin. – SPb. : b. i., 1902. – 192 s.
16. *Rubakin, N. A.* Rossiya v tsifrakh. Opyt statisticheskoy kharakteristiki soslovno-klassovogo sostava naseleniya russkogo gosudarstva / N. A. Rubakin. – SPb. : Izd-vo “Vestnika znaniya” (V. V. Bitenra), 1912. – 216 s.
17. *Solovyov, Yu. B.* Samoderzhaviye i dvoryanstvo v kontse XIX veka / Yu. B. Solovyov. – L. : Nauka, 1973. – 378 s.
18. *Solovyov, Yu. B.* Samoderzhaviye i dvoryanstvo v 1902–1907 gg. / Yu. B. Solovyov. – L. : Nauka, 1981. – 256 s.
19. *Dyakin, V. S.* Samoderzhaviye, burzhuaziya i dvoryanstvo v 1907-1911 gg. / V. S. Dyakin. – L. : Nauka, 1978. – 246 s.
20. *Dyakin, V. S.* Burzhuaziya, dvoryanstvo i tsarizm v 1911–1914 gg.: Razlozheniye tretyeiyunskoy sistemy / V. S. Dyakin. – L. : Nauka, 1988. – 230 s.
21. *Korelin, A. P.* Dvoryanstvo v poreformennoy Rossii. 1861–1904 gg. Sostav, chislennost, korporativnaya organizatsiya / A. P. Korelin. – M. : Nauka, 1979. – 304 s.
22. *Ignatouski, U.* Karotki narys gistoryi Belarusi / U. Ignatouski. – 5-ye vyd. – Minsk : Belarus, 1991. – 140 s.
23. *Tsvikevich, A.* “Zapano-russizm”. Narysy z gistoryi gramadszkay mysli na Belarusi u XIX i pachatku XX v. / A. Tsvikevich. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1993. – 350 s.
24. *Sambuk, S. M.* Politika tsarizma v Belorussii vo vtoroy polovine XIX veka / S. M. Sambuk. – Minsk : Nauka i tekhnika, 1980. – 223 s.
25. *Lugovtsova, S. L.* Politika rossiyskogo samoderzhaviya po otnosheniyu k dvoryanstvu Belarusi v kontse XVIII – pervoy polovine XIX v. : dis. … kand. ist. nauk: 07.00.02 / S. L. Lugovtsova. – Minsk, 1997. – 130 l.
26. *Tumilovich, G. N.* Dvoryanstvo Belarusi v kontse XVIII – pervoy polovine XIX v. : dis. … kand. ist. nauk : 07.00.02 / G. N. Tumilovich. – Minsk, 1997. – 165 l.
27. *Makarevich, V. S.* Drobnaya shlyakhta Belarusi u 30-60-ya gg. XIX st. : sklad i evalyutsyya satsyyalna-pravavoga stanovishcha / V. S. Makarevich. – Minsk : BDU, 2008. – 159 s.
28. *Grytskevich, A.* Belaruskaya shlyakhta / A. Grytskevich // Spadchyna. – 1993. – № 1. – S. 11–16.


Рэпазіторый БДПУ

29. *Сяменчык, М. Я.* Становішча гарадской шляхты Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. (Сацыяльны аспект) / М. Я. Сяменчык // Нацыянальная палітыка расійскага самадзяржаўя на Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XIX стагоддзяў. – Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка, 1995. – С. 128–151.
30. *Каханоўскі, А. Г.* Дваранства Беларусі ў другой палове XIX ст.: склад і сацыяльнае аблічча / А. Г. Каханоўскі // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь (новыя канцэпцыі і падыходы) : Усебеларуская канф. гісторыкаў, Мінск, 3–5 лютага 1993 г. : у 2-х ч. – Мінск : Універсітэцкае, 1994. – Ч. 1 : Гісторыя Беларусі. – С. 103–109; Каханоўскі, А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.) / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : БДПУ, 2013. – 335 с.
31. *Тальвирская, З. Я.* К вопросу о социальном облике мелкого дворянства в 1960-х годах (по материалам трех уездов Минской губернии) / З. Я. Тальвирская // Историко-социологические исследования. – М. : Наука, 1970. – С. 198–216.
32. *Жытко, А. П.* Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг. / А. П. Жытко. – Мінск : БДПУ, 2003. – 233 с.
33. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. / А. А. Каваленя [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука. – Кн. 1. – 2011. – 584 с.
34. Mienicki, Ryszard. Ziema Nowogródzka w dobie porozbiorowej (1793–1915) / Ryszard Mienicki. – Wilno : Księgarnia św.Wojciecha, 1935. – 80 s.
35. *Wakar, W.* Rozwój terytorialny narodowości polskiej. Cz. 3, Statystyka narodowościowa kresów wschodnich / W. Wakar. – Kielce : Wydawnictwo Biura Pracy Społecznej, 1917. – 213 s.
36. *Eberhardt, P.* Przemianiy narodowościowe na Białorusi / P. Eberhardt. – Warszawa : Editions Spotkania, 1994. – 47 s.
37. *Werenicz, W.* Historyczne i kulturalne podstawy swiadomości narodowej połaków w Związku Radzieckim (na przykładzie Republiki Białoruskiej) / W. Werenicz // Połacy w kościole katolickim w ZSRR /pod. red. ks. E. Walewandra. – Lublin : Uniwersytet Rzeszowskiego, 1991. – S. 197–212.
38. *Radzik, R.* Między zbiorowością etniczną a wspólnotą narodową. Białorusini na tle przemian narodowych w Europie Środkowo-Wschodniej XIX stulecia / R. Radzik. – Lublin : Uniwersytet Marii Curie-Skłodowskiej, 2000. – 140 s.
39. *Sikorska-Kulesza, I.* Deklasacija drobnej szlachty na Litwie i Białorusi w XIX wieku / I. Sikorska-Kulesza. – Warszawa : Ajaks, 1995. – 113 s.
40. *Беккер, С.* «Миф о русском дворянстве: Дворянство и привилегии последнего периода императорской России» / С. Беккер ; пер. с англ. Б. Пинскера. – М. : Новое литературное обозрение, 2004. – 344 с.

29. *Syamenchyk, M. Ya.* Stanovishcha garadskoy shlyakhty Belarusi u kantsy XVIII – pershay palove XIX st. (Satsyyalny aspect) / M. Ya. Syamenchyk // Natsyyanalnaya palityka rasiyskaga samadzyarzhauya na Belarusi u kantsy XVIII – pachatku XIX stagoddzyau. – Minsk : Belarus. dzyarzh. ped. un-t imya M. Tanka, 1995. – S. 128-151.
30. *Kakhanouski, A. G.* Dvaranstva Belarusi u drugoy palove XIX st.: sklad i satsyyalnaye ablichcha / A. G. Kakhanouski // Gistarychnaya navuka i gistarychnaya adukatsyya u Respublitsy Belarus (novyya kantseptsyi i padykhody) : Usebelaruskaya kanf. gistorykau, Minsk, 3-5 lyutaga 1993 g. : u 2 ch. – Minsk : Universitetskaye, 1994. – Ch. 1 : Gistoryya Belarusi. – S. 103–109; Kakhanouski, A. G. Satsyyalnaya transfarmatsyya belaruskaga gramadstva (1861–1914 gg.) / A. G. Kakhanouski. – Minsk : BDPU, 2013. – 335 s.
31. *Talvirskaya, Z. Ya.* K voprosu o sotsialnom oblike melkogo dvoryanstva v 1960-kh godakh (po materialam tryokh uyezdov Minskoy gubernii) / Z. Ya. Talvirskaya // Istoriko-sotsiologicheskiye issledovaniya. – M. : Nauka, 1970. – S. 198–216.
32. *Zhytko, A. P.* Dvaranstva Belarusi peryyadu kapitalizmu. 1861–1914 gg. / A. P. Zhytko. – Minsk : BDPU, 2003. – 233 s.
33. Gistoryya belaruskay dzyarzhaunastsi u kantsy XVIII – pachatku XXI st. : u 2 kn. / A. A. Kavalenya [i insh.] ; redkal.: A. A. Kavalenya [i insh.]. – Minsk : Belarus. navuka. – Kn. 1. – 2011. – 584 s.
34. Mienicki, Ryszard. Ziema Nowogrydzka w dobie porozbiorowej (1793–1915) / Ryszard Mienicki. – Wilno : Księgarnia św. Wojciecha, 1935. – 80 s.
35. *Wakar, W.* Rozwyj terytorialny narodowości polskiej. Cz. 3, Statystyka narodowościowa kresyw wschodnich / W. Wakar. – Kielce : Wydawnictwo Biura Pracy Społecznej, 1917. – 213 s.
36. *Eberhardt, P.* Przemianiy narodowościowe na Białorusi / P. Eberhardt. – Warszawa : Editions Spotkania, 1994. – 47 s.
37. *Werenicz, W.* Historyczne i kulturalne podstawy swiadomości narodowej połakyw w Związku Radzieckim (na przykładzie Republiki Białoruskiej) / W. Werenicz // Połacy w kościole katolickim w ZSRR /pod. red. ks. E. Walewandra. – Lublin : Uniwersytet Rzeszowskiego, 1991. – S. 197–212.
38. *Radzik, R.* Między zbiorowością etniczną a wspylnotą narodową. Białorusini na tle przemian narodowych w Europie Środkowo-Wschodniej XIX stulecia / R. Radzik. – Lublin : Uniwersytet Marii Curie-Skłodowskiej, 2000. – 140 s.
39. *Sikorska-Kulesza, I.* Deklasacija drobnej szlachty na Litwie i Białorusi w XIX wieku / I. Sikorska-Kulesza. – Warszawa : Ajaks, 1995. – 113 s.
40. *Bekker, S.* "Mif o russkom dvoryanstve: Dvoryanstvo i privilegii poslednego perioda imperatorskoy Rossii" / S. Bekker ; per. s angl. B. Pinskera. – M. : Novoye literaturnoye obozreniye, 2004. – 344 s.

Репозиторий БГПУ